Источник: "Наша слова" - 2013-09-11

# 120 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Ляўданскага



**ЛЯЎДАНСКІ Аляксандр Мікалаевіч** (29.08 (10.09).1893 г., в. Юр'ева Смалявіцкага р-на - 27.08.1937 г.) - беларускі гісторык, археолаг, кандыдат гістарычных навук (1934). Скончыў Смаленскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута (1922). З 1927 г. член гісторыка-археалагічнай камісіі Інбелкульта, загадчык аддзела археалогіі Беларускага дзяржаўнага музея. З 1931 г. вучоны сакратар, загадчык секцыі археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР, адначасова дацэнт БДУ. Арганізатар першых навуковых археалагічных экспедыцыяў па Беларусі. Зрабіў класіфікацыю гарадзішчаў жалезнага веку, вызначыў іх культурна-археалагічную прыналежнасць і арэалы археалагічных культураў, акрэсліў асноўныя рысы матэрыяльнай культуры, гаспадаркі і патрыярхальна-радавога ладу плямёнаў, якія жылі па тэрыторыі Беларусі ў жалезным веку. Даследаваў Віцебск, Оршу, Заслаўе, Барысаў, даў першую і найбольш поўную гістарычную тапаграфію старажытнага Полацка, вывучаў яго старажытныя архітэктурныя помнікі (Сафійскі сабор, Спаса-Ефрасіннеўская царква, Бельчыцкія храмы). Раскопваў курганы эпохі Кіеўскай Русі на тэрыторыі Беларусі, выявіў і даследаваў прылады працы, зброю і ўпрыгожанні. У 1937 годзе па ілжывым абвінавачванні арыштаваны і расстраляны ў Менску (27.08.1937). У 1958 г. рэабілітаваны.

**Асноўныя працы:**

Неалітычныя стаянкі ў Смаленскай губерні / Аляксандр Ляўданскі. - Мн., [1925].

Раскопкі і археалагічныя разведкі ў Барысаўскім павеце. Сляды неалітычнай стаянкі і пазнейшых культур каля м. Новага Быхаву / А. Н. Ляўданскі; Ін-т бел. культуры. - Мн., 1925.

Да гісторыі жалезнага промыслу на Палессі : Рудні і месцазнаходжанні руды / А. Н. Ляўданскі. - Мн., 1933. - (Працы Палескай экспедыцыі / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі імя М. Н. Пакроўскага, Секцыя археалогіі; вып. 2).

Археалагічныя раскопкі ў м. Заслаўі Менскай акругі // Кн. 5. Працы кафедры археалогіі. Т. 1. Мн., 1928 і інш.

*Вікіпедыя.*

"Наша слова". 120 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Ляўданскага